ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЕНІНСКІМ ШЛЯХАМ

Орган Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту

ЧАЦЬВЕР
27 ЛЮТАГА 1930 г.
№ 4
Выходзіць 2 разы на месяц

Падпісная цана 10 кап. на месяц

Адрас Рэдакцыі:
МЕНСК,
Праўленьне БДУ

змах падрыхтоўкі кадраў, пачынаючы ад інжэнэра і канчаючы кваліфікаваным рабочым, павінен адпавядаць агульнаму размаху сацыялістычнага будаўніцтва.

(З РЭЗАЛЮЦЫІ ЛІСТАПАДАЎСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б).

НАШЫ ЗАДАЧЫ.

лікія задачы, якія стаяць пе- Савецкім Саюзам, ня могуць патрабаваць належнай зьме- прыстасаваньня ўсёй струк- і ўсяго характару работ й сыстэмы вышэйшай ась- і. На вышэйшую школу адаецца найважнейшая част- вялізарнай задачы—падрых- а кадраў. Ад разьвязаньня й задачы—гаварыў тав. Ста- —залежыць у значнай сту- разьвязаньне ўсіх задач, стаяць перад краінай, што е сацыялізм.

к-жа мы, у нашым Унівэр- це, спраўляемся з гэтай за- й? Трэба прызнаць проста: раўда, тут былі, як кажуць, оставіны „аб'ектыўнага" па- у (чыстка партарганізацыі, бны перапынак), але яшчэ мі і вельмі многа залежыць недастатковай нашай дысцы- аванасьці, ад дрэннага тэм- работы, ад няўменьня пра- на і точна працаваць.

можа быць, найбольш сла- праводзіцца справа рацыяна- цыі акадэмічнай работы. Тут ш усяго дасягненьняў, а авіта тут патрабуюцца най- кшыя зьмены. У прыват- ьці прынятыя за апошні час арадку выкананьня пастано- Пленуму ЦК КПБ пастановы скарачэньні тэрмінаў наву- ьня, аб датэрміновых выпу- х на ўсіх аддзяленьнях Пэд- у і Правгасу, аб увядзеньні ьперапыннага навучальнага у, ставіць перад студэнцтвам авуковымі працаўнікамі такія ачы, якія н я м о г у ц ь б ы ц ь кананы б е з в я л і з а р г а н а п р у ж а н ь н я с і л к і я п а в і н н ы б ы ц ь в ы н а н ы а б а в я з к о в а і б е з в о р а к.

скарачэньне тэрмінаў наву- ьня асаблівую цяжкасьць ладае менавіта на гэты на- альны год—у 1930 г. на ўсіх зяленьнях Пэдфаку і Прав- павінны быць д в а выпу- —выпускі цяперашняга 3 і 4 саў. У сувязі з гэтым стаіць вая задача перагляду ў с і х в у ч а л ь н ы х п л я н а ў у ы найкароткі тэрмін.

Але гэтае скарачэньне тэрмі- навучаньня ніякім чынам ня ка быць зроблена за лік зьні- ньня якаснага ўзроўню лю- амізай, якія выпускаюцца з Уні- сытэту — спэцыялістых. Ня ка быць і таму гэтае зьні- ньне, што ўзровень і без та- арнедастаткова высокі і яшчэ ту, што патрабаваньне цяпер спэцыялістых ня зьніжаецца, павышаецца.

і для каго не сакрэт, што ін з асноўныя дэфэктаў усёй тэмы асьветы, асабліва ў нас БДУ зьяўлялася неадпавед- ьць паміж характарамі занят- і тыпам працаўніка, якога рыхтоўваў Унівэрсытэт. Не крэт, што амаль усе лекцый- я курсы адрозьніваліся тым, о лектар чытаў ня тое, што трэбна студэнтам, а тое, што авіла яго. Нават тады, калі есь курс чытаўся па праграме, дык і тады звычайным і рымаўшым права грамадзян- за ва ўсіх лекцыйных курсах зьяўлялася своеабразная архітэктоніка курсу: цэлыя аддзелы праграмы комкаліся, іншы раз найбольш важныя для студэнтаў, а некаторыя аддзелы штучна расшыраліся і чыталіся амаль ня ўвесь сэместр, калі дастаткова было 2-х навучальных тыдняў.

Не сакрэт таксама і тое, што да апошняга часу ў нас захоўваўся шэраг дыспыплін, ня маючых сур'ёзнага значэньня, як правільна ўказвае ў сваёй пастанове Бюро парткалектыву: „Ні для фармаваньня марксыцка-ленінскага сьветапогляду, ні для будучай практычнай працы спэцыялістых.

У нас меліся і такія дысцыпліны, аб якіх прыходзіцца, па сутнасьці, сказаць тое, што Маркс гаварыў аб буржуазных тэорыях: „Этыкетка ашукоўвае". Судзячы па назьве, па належнаму зьместу дысцыплін яе сапраўды неабходна выкладаць усе 3 вучэбныя гады, але пры бліжэйшым-жа набліжэньні да сапраўднага зьместу выкладаемага прадмету аказваецца, у сілу розных прычын, што ўсё тое карыснае і патрэбнае, што гэтая дысцыпліна ў цяперашніх умовах, пры сучасных навуковых кадрах можа даць, з посьпехам можа быць усвоена студэнцтвам у значна меншы тэрмін.

Роўналежна і побач з гэтым неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на характар і зьмест мэтадалёгічных дысцыплін. Ня толькі не адмовіцца ад дысцыплін, якія выхоўваюць ідэйна-палітычны сьветапогляд студэнцтва, але і п а в я л і ч ы ц ь гэтыя заняткі і п а л е п ш ы ц ь мэтады прапрацоўкі.

Сорамна і сьмешна:у гады вялікай ломкі і перабудовы ўсяго нашага жыцьця мы па стараму жвем сухую жвачку агульных разважаньняў аб залежнасьці зьместу філёзофіі (наогул) ад разьвіцьця вытворчых сіл (наогул), калі ўсё багацьце ўсіх дыялектычных катэгорый можна выцягнуць з практыкі калгаснага руху, калі напрыклад, калгасная рэвалюцыя растлумачыць зьмест і сутнасьць асноўных законаў дыялектыкі. Як часта мы грызем сухую костку абстрактнай працы, ня ўмеючы знайсьці мата ад тэорыі працоўнай вартасьці да эканомікі пераходнага часу; як часта ў нас нават і ня шукаюць гэтага маста!

Скарачэньне тэрмінаў навучаньня не а д х і л я е, а в а с т р э ш т а в і ц ь п ы т а н ь н е аб усіх тых дысцыплінах, якія павінны фармаваць марксыцка-ленінскі сьветапогляд. Тут пагроза ня ў тым, што мы за 3 гады атрымаем менш, чым раней за 4 гады, пагроза ў тым, што мы за 3 гады будзем атрымоўваць таксама мала, як раней у 4.

І тут мы павінны забіць трывогу. У нас на жаль няма матар'ялу для лічбовага выражэньня выкананьня нашага унівэрсытэцкага „прамфінпляну", але мы ня сумляваемся, што па разьмерах выкананьня мы можам канкураваць з горшымі вытворчымі адзінкамі Беларусі.

Далейшае замядленьне немагчыма. Яно зробіць немагчымым выкананьне рашэньня пленуму ЦК КП(б)Б.

Мы патрабуем:

1. Неакладнага перагляду усіх вучэбных плянаў пад кутком погляду задач падрыхтоўкі спэцыялістых азначанага тыпу.

2. Праверкі зьместу фактычна чытаемых дысцыплін пад кутком погляду адпаведнасьці пісаных праграм.

3. Неадкладнай выпрацоўкі пляну работ дысцыплін, пераходзячых на актыўны мэтад выкладаньня з дакладным падэкадным указаньнем характару прапрацоўваемых праблем, правадзімых работ, тэмп, дадатковых лекцый і г. д.

4. Неадкладных точных указаньняў на зьмены ў далейшай рабоце па ўсіх дысцыплінах усіх трэціх курсаў і аддзяленьняў факультэтаў, якія выпускаюцца датэрмінова.

Гэта той мінімум, які павінен быць выкананы ў першы-ж тыдзень. Выкананьне гэтага мінімуму патрабуе напружанай працы, але тут няма месца агаворкам. У выкананьні пастаўленых рэвалюцыяй задач на ўсіх участках агромнага баявога фронту, фронту сацыялістычнага будаўніцтва, партыя ня ведае дрэнных умоў, яна ведае толькі дрэнных працаўнікоў.

Прыняць рашучыя меры супроць вінаватых у зрыву заняткаў.

Паскарэньне выпускаў усіх факультэтаў БДУ цесна зьвязана з узмацненьнем тэмпаў нашай вучобы.

Практыка першых дзён другога сэместру паказала як далека разыходзяцца словы нашых кіраўнікоў са справамі. Спашлемся на факты: процант студэнтаў, якія спазьніліся і своечасова не зьявіліся на заняткі дасягае 10—15%, але каму вядома, якія меры прыняты супроць гэтага безабразнага зьявішча?

Спазьніліся і не зьявіліся своечасова на заняткі ня толькі студэнты, але і навуковыя працаўнікі. Некалькі вечароў ня было заняткаў з-за адсутнасьці сьвятла на Правгасе і на Пэдфаку. Чему дапусьцілі такое злачынства і ня прынялі ніякіх мер супроць гэтага?

Пераход да актыўнага мэтаду заняткаў зьвязаны з неабходнасьцю забесьпячэньня дастатковай колькасьці падручнікаў. Практычна-ж мы маем вельмі абмежаваную колькасьць літаратуры, якая таму-ж знаходзіцца ў габінэтах у старым будынку. Кожны раз паўгадзіны губляецца на дастаўку патрэбных кніжак.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што да новых тэмпаў працы пасьля вакацый ні Дэканат, ні партпрафарганізацыі не падрыхтаваліся.

Такія „тэмпы" працы ставяць пад пагрозу зрыву сацспаборніцтва.

А. Самахвалаў.

Рэарганізаваць і палепшыць працу прафарганізацый.

Рэарганізацыя прафсаюзнай работы БДУ павінна спрасьціць работу Прафкому і Выканбюро з тым, каб перанесьці асяродак працы ў Прафкомы і акадэм-групы.

За Выканбюро захоўваецца агульнае кіраўніцтва, кантроль і арганізацыя агульна-унівэрсытэцкай працы. Існуючыя камісіі пры Выканбюро: эканом, акадэм, палітасьвет камісіі ліквідуюцца. Работа Выканбюро разьбіваецца на 3 сэктары. За працу кожнага сэктару адказвае пэўная асоба, якая можа прыцягваць да асобных галін работы асобных студэнтаў.

У такім-жа напрамку рэарганізуецца праца Прафкомаў, якія таксама пераводзяць працу на функцыянальную сыстэму, арганізуючы паасобныя сэктары. Па аддзяленьнях Пэдфаку і Правгасу абіраюцца прафупаўнаважаныя, якія працуюць пад кіраўніцтвам прафкомаў.

Па факультэтах і аддзяленьнях, дзе маюцца сталыя акадэмічныя групы, абіраецца адзін прафупаўнаважаны групы, а дзе гэткіх няма, абіраецца прафупаўнаважаны курсу.

У сувязі з перанясеньнем усёй прафсаюзнай работы на аддзяленьні і курсы, галоўным чынам у акадэмічныя групы, роля прафупаўнаважанага групы ці іншай нізавой арганізацыйнай адзінкі ўзрастае да ролі сапраўднага кіраўніка палітыка-грамадзкага выхаваньня і вытворчай актыўнасьці студэнтаў.

На ўзмацненьне акадэмічнай працы па групах абіраюцца акадэмупаўнаважаныя — 1 на групу; па аддзяленьнях (па спэцыяльнасьцях) абіраюцца вытворчыя камісіі, якія займаюцца абгаварэньнем пытаньняў палепшаньня нашай вытворчасьці. Па аддзяленьнях ці факультэтах тых-жа спэцыяльнасьцяй утвараюцца вытворчыя нарады па прыкладу вытворчых нарад на фабрыках і заводах.

Агульна-унівэрсытэцкія канфэрэнцыі з удзелам навуковых і тэхнічных працаўнікоў, гаспадарнікаў, прафарганізацый, рабочага актыву склікаюцца ня больш 1-2 разоў у год.

Але нельга сказаць, каб гэтая сыстэма рэарганізацыі была самая найлепшая. Лепшую сыстэму працы можна ўтварыць толькі пры ўдзеле ўсёй масы студэнцтва і навуковых працаўнікоў, на глебе разгорнутай самакрытыкі. Аб становішчы працы нашых прафарганізацый і Выканбюро і мерапрыемствах па яе палепшаньню студэнцкая маса і навуковыя працаўнікі павінны сказаць яшчэ сваё слова.

С. Рабцэвіч.

Хэмфакаўцы за вучобай.

Увага сацыялістычнаму спаборніцтву.

(3-я курсы Сац.-Гістарычн. і Літ.-Лінгв. Аддз. Пэдфаку).

У канцы першага паўгодзьдзя навучальнага году 3-я курсы Сацыяльна-Гістарычнага і Літаратурна-Лінгвістычнага Аддзяленьняў Пэдфаку сабраліся на агульны сход, каб праверыць як выконваецца дагавор па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Сацспаборніцтва, як паказаў сход, узьняла вучобу, паставіла яе на новыя рэйкі. Шмат якія пункты дагавору выкананы на 100%. Выяўлены і недахопы. Слаба пастаўлен падлік працы. Лічбы бяруцца „прыблізныя". Тройкі рэгулярна не працавалі, не ўказвалі злосных зрыўшчыкаў.

Па некаторых пытаньнях Сацыяльна-гістарычнае аддзяленьне значна перавышае Літаратурнае: як змаганьне з варожай ідэалёгіяй, ачышчэньне ад варожых элемэнтаў.

Наведваньне чужаземных моў па Сацыяльна-Гістарычнаму Аддзяленьню складае 100%, Літаратурнаму—70%.

Наогул-жа лекцыі наведваюцца на 66, а сэмінары на 74%.

Па ўжываньні бел. мовы дагавор выканан на 100%, але частка студэнцтва ўжывае яе толькі на занятках, у прыватным-жа жыцьці карыстаецца расійскай мовай.

Добра працуюць гурткі бягучай палітыкі. Процант наведваньня—56.

Газэты выпісваюцца на 100%.

Па выпісцы-ж сваёй газэты „Ленінскім шляхам" Літаратурнае Аддзяленьне адстае, тут толькі 50%.

Пазыкай індустрыялізацыі па Літаратурнаму Аддзяленьню ахоплена 81%. Не падпісаліся ўтрыманцы. Разам з імі не падпісаліся і пісьменьнікі Глебка і Адамовіч.

Сход наведваюць толькі на 50%.

Прыкры факт меў месца на Літаратурным аддзяленьні, калі праф. В я з ь н я с е н с к і, каб вырашыць ідэалёгічную вытрыманасьць дакладу, ставіць гэтае пытаньне на галасаваньне курсу.

Другое паўгодзьдзе павінна даць 100% вынікі дагавору. З гэтай мэтай 3 курс Сацыяльна-Гістарычнага Аддзяленьня на агульным сходзе абвясьціў сябе ударным.

Вінаградаў.